Address: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
Phone: +36 1 318 6923 Web: www.ecnl.org
Fax: +36 1 266 1479 Twitter: @enablingNGOLaw

# ВАЛАНТЭРСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ – ЕЎРАПЕЙСКІЯ ПРАКТЫКІ РЭГУЛЯВАННЯ[1]

*30 чэрвеня 2014*

## 1. УВОДЗІНЫ

Валантэрства з'яўляецца неад'емнай часткай развітай грамадзянскай супольнасці, спрыяе яе развіццю і росквіту. Больш за тое, значэнне валантэрства можна разглядаць і з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнага капіталу. Міжнародныя структуры, такія як Генеральная Асамблея ААН[2], Еўрапейскі парламент[3] і Парламенцкая асамблея Савета Еўропы[4], заклікаюць ўрады прызнаваць каштоўнасць валантэрства і спрыяць прыцягненню валантэраў да разнастай дзейнасці. У адказ на гэта шматлікія краіны распрацавалі комплексныя прававыя рамкі, якія рэгулююць і абараняюць валантэрскую дзейнасць і заангажаваных валантэраў.

У дадзеным дакладзе будуць прадстаўленыя розныя падыходы да рэгулявання валантэрскай дзейнасці, а таксама розныя мадэлі рэгулявання на прыкладзе розных краін Еўропы. У дакладзе мы таксама закранем азначэнне валантэрскай дзейнасці і карысць валантэрства для грамадства. Мы пастараемся растлумачыць неабходнасць рэгулявання і стымулявання валантэрства, закранем агульныя пытанні рэгулявання валантэрскай дзейнасці. У дакладзе, на прыкладзе розных краін, будуць дадзены апісанні розных мадэляў рэгулявання, якія існуюць у Еўропе, а таксама іх характэрныя прыкметы. Адпаведна, мы пастараемся прааналізаваць пазітыўныя і негатыўныя аспекты валантэрскай дзейнасці і, на аснове вывучаных урокаў, прапануем рэкамендацыі для далейшых заканадаўчых ініцыятыў.

## 2. АЗНАЧЭННЕ ВАЛАНТЭРСТВА

З-за адсутнасці універсальнага разумення тэрмінаў “валантэр” і “валантэрская дзейнасць”, не існуе адзінага азначэння валантэрства. Некаторыя міжнародныя структуры, у тым ліку ААН[5], Міжнародная Арганізацыя Працы (МАП) і Савет ЕС[6], паспрабавалі даць азначэнне валантэрства. Зыходзячы з мэтаў дадзенага дакладу, азначэнне, распрацаванае Міжнароднай Арганізацыяй

[1] Гэты даклад падрыхтаваны Еўрапейскім Цэнтрам Некамерцыйнага Права (ЕЦНП) па просьбе Цэнтра Прававой Трансфармацыі і Асамблеі Няўрадавых Дэмакратычных Арганізацый Беларусі. Еўрапейскі Цэнтр Некамерцыйнага Права - вядучы еўрапейскі рэсурсны і даследчы цэнтр у сферы заканадаўства аб грамадзянскай супольнасці, які месціцца ў Будапешце. Яго мэтамі з'яўляюцца садзейнічанне стварэнню спрыяльных прававых і падатковых умоў для грамадзянскай супольнасці ў Еўропе і распаўсюд еўрапейскага досведу ў іншых частках свету.

2 Усе рэзалюцыі ААН па пытаннях валантэрства можна знайсці па спасылцы: http://www.unv.org/news-resources/ resources / un-resolutions.html

3 Напрыклад, Еўрапейскі парламент: Рэзалюцыя ад 12 чэрвеня 2012 аб прызнанні і прасоўванні трансгранічнай валантэрскай дзейнасці ў ЕС, 2012

4Напрыклад, Парламенцкая асамблея Савета Еўропы: Рэкамендацыя 1496: Прасоўванне валантэрства ў Еўропе, 2001

[5] Валантэрская праграма ААН, 1999: “Валантэрства ў шырокім сэнсе можна акрэсліць як некамерцыйны, неаплатны, некар’ерны ўнёсак індывідаў у дабрабыт сваіх суседзяў, супольнасці і грамадства агулам”.

[6] Савет ЕС: Рашэнне аб аб'яўленні года валантэрскай дзейнасці і фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі (2011), стар 3

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

Працы (МАП) у “Дапаможніку па ацэнцы валантэрскай працы”[7], можна лічыць найбольш прыдатным:

**Валантэрская праца** – неаплатная неабавязковая праца; г.зн. час, які асобы выдаткоўваюць бязвыплатна на дзейнасць, якая ажыццяўляецца альбо праз арганізацыю, альбо непасрэдна ў інтарэсах іншых асоб, якія не ўваходзяць у склад іх уласнай хатняй гаспадаркі.

Зыходзячы з гэтага азначэння, можна вылучыць наступныя ключавыя характарыстыкі валантэрскай дзейнасці:

1. ***Валантэрства прадугледжвае дзейнасць альбо працу.*** Валантэрства - гэта дзейнасць, якая робіць унёсак у вытворчасць тавараў альбо паслугаў, накіраваная не выключна на карысць валантэра. Акрамя таго, дзейнасць павінна ажыццяўляцца на працягу пэўнага перыяду часу, у адпаведнасці з сусветнымі стандартамі, на працягу ня менш адной гадзіны.
2. ***Валантэрства не аплочваецца.*** Валантэрства па азначэнні з'яўляецца дзейнасцю без аплаты або ўзнагароджання. Аднак, валантэры могуць атрымліваць стыпендыі альбо кампенсацыю за неабходныя выдаткі (напрыклад, выдаткі на паездкі, пражыванне), не парушаючы пры гэтым азначэнне валантэрства. Але такія формы грашовай падтрымкі альбо падтрымкі ў натуральнай форме ня могуць уяўляць сабой значнае ўзнагароджанне, зыходзячы з стандартаў той мясцовасці, дзе ажыццяўляецца валантэрская дзейнасць.
3. ***Валантэрства - справа добрай волі***. Валантэрства не павінна быць прымусовым і павінна ўключаць у сябе элемент выбару. Неаплатная праца, загаданая рашэннем суда, якая з'яўляецца часткай турэмнага пакарання або ваеннай службы, выключаецца з азначэння валантэрства. Прымусовая неаплатная праца ў постсавецкіх краінах таксама ня лічыцца валантэрствам.
4. ***Валантэрства прымае як індывідуальную (прамую), так і арганізацыйную форму.*** Увогуле, валантэрства павінна ўключаць валантэрскую дзейнасць, якая ажыццяўляецца як праз арганізацыю альбо на карысць арганізацыі, так і непасрэдна на карысць пэўнай хатняй гаспадаркі. Але некаторыя краіны разрозніваюць гэтыя дзьве формы і рэгулююць толькі валантэрскую дзейнасць на аснове арганізацый.
5. ***Валантэрства ажыццяўляецца па-за хатняй гаспадаркі валантэра і не абмяжоўваецца пэўным бенефіцыярам.*** Валантэрская дзейнасць ажыццяўляецца на карысць іншых асоб, а не асоб, якія пражываюць сумесна з валантэрам, а таксама ў дачыненні да больш шырокага кола бенефіцыяраў, уключаючы навакольнае асяроддзе, жывёл і г.д.

Акрамя гэтага, азначэнне МАП ўключае ў сябе валантэрскую дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў межах усіх тыпаў грамадскіх інстытутаў, такіх як некамерцыйныя арганізацыі, урады, прыватны бізнэс і гэтак далей. Аднак многія краіны дазваляюць толькі некамерцыйным арганізацыям і дзяржаўным установам служыць у якасці валантэрскіх арганізацый[8].

[7] Міжнародная Арганізацыя Працы: Дапаможнік па ацэнцы валантэрскай працы, 2011
[8] Міжнародная Арганізацыя Працы: Дапаможнік па ацэнцы валантэрскай працы, 2011

ECNL
**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

## 3. НАВОШТА РЭГУЛЯВАЦЬ ВАЛАНТЭРСКУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ?

У той час як сацыяльны і эканамічны[9] ўнёсак валантэрскай дзейнасці ў развіццё грамадства бясспрэчны і заслугоўвае абароны, не існуе адзінага спосабу забяспечыць абарону і рэгуляванне правоў і абавязкаў валантэраў і валантэрскіх арганізацый. Адсутнасць рэгулявання не абавязкова будзе праблемай, але поўная адсутнасць прававых палажэнняў у гэтай сферы стварае перашкоды для ажыццяўлення валантэрскай дзейнасці. Праблемы звычайна ўзнікаюць з-за адсутнасці выразнага прававога статусу валантэраў, які б адрозніваў іх ад наёмных работнікаў, а таксама выразных патрабаванняў да іх дзейнасці, што дазваляе таксама забяспечыць абарону іх правоў і ільгот. Глыбокі аналіз выяўляе наступныя прававыя перашкоды, якія вынікаюць з неспрыяльных прававых рамак, якія існуюць у Еўропе[10]:

**i.** Адсутнасць ***юрыдычнага азначэння*** тэрміна "валантэр" можа прыводзіць да таго, што да валантэраў ставяцца як да аплачваемых наёмных работнікаў, ужываючы да іх патрабаванні працоўнага заканадаўства (напрыклад, абавязковае страхаванне, нормы мінімальнай аплаты працы і г.д.). З-за гэтага АГС, якія працуюць з валантэрамі, могуць несці пакаранне за невыкананне дадзеных палажэнняў. Напрыклад, у **Турцыі** АГС атрымліваюць штрафы за наяўнасць незастрахаваных работнікаў, бо патрабаванне па абавязковаму страхаванню работнікаў распаўсюджваецца і на валантэраў[11]. Такая ж праблема існуе і ў **Албаніі**, дзе АГС абавязаныя рэгістраваць валантэраў у Бюро занятасці і вымушаныя аплачваць іх страхаванне пад пагрозай сур'ёзнага пакарання[12].

**ii.** ***Правы і ільготы***. З-за адсутнасці выразнага статусу валантэраў, валантэрская дзейнасць, якая ажыццяўляецца па-за сферай рэгулявання працоўным заканадаўствам, можа трактавацца як нелегальная праца. Гэта можа прывесці да страты валантэрамі пэўных ільгот, такіх як сацыяльнае забеспячэнне і дапамога па беспрацоўю.

**iii.** ***Падаткаабкладанне***, якое распаўсюджваецца на пакрыццё выдаткаў, звязаных з валантэрскай дзейнасцю, застаецца вялікай праблемай у неспрыяльных прававых умовах. З-за таго, што кампенсацыя павінна пакрываць толькі неабходныя выдаткі валантэра, любыя падатковыя вылічэнні, якія вылічваюцца з агульнай сумы, маюць значэнне і ствараюць практычныя перашкоды для прыцягнення валантэраў. Некаторыя еўрапейскія арганізацыі (напрыклад, Фонд Роберта Шумана ў Польшчы) назвалі падаткаабкладанне, якое распаўсюджваецца на кампенсацыю выдаткаў, галоўнай перашкодай пры адпраўцы замежных валантэраў у **Грузію**. Гэтая праблема павінна быць вырашана пасля прыняцця новага законапраекта аб валантэрстве, які ўносіць папраўкі да падатковага кодэксу, згодна якім ўводзяцца падатковыя ільготы ў дачыненні да валантэрскай дзейнасці. У **Эстоніі** толькі некамерцыйным аб'яднанням і

---

[9] Для прыкладу можаце азнаёміцца з апошнімі ацэнкамі эканамічнага ўнёску валантэрства, якія былі праведзеныя Цэнтрам Джона Хопкінса :: / / ccss.jhu.edu / research-projects / volunteer-measurement / about-volunteer-measurement

[10] Больш прыкладаў прававых перашкодаў для валантэрскай дзейнасці можна знайсці: Кэтрын Шы і Кацярына Хадзі-Міцэва: Права аб валантэрах і валантэрскай дзейнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, 2007

[11] Фонд Трэцяга Сектара Турцыі (TUSEV): Маніторынг матрыцы для стварэння ўмоваў для развіцця грамадзянскай супольнасці, даклад па краіне: Турцыя, 2013

[12] Партнэры Албаніі: Маніторынг матрыцы для стварэння ўмоваў для развіцця грамадзянскай супольнасці, даклад па краіне: Албанія, 2013

Address: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
Phone: +36 1 318 6923 Web: www.ecnl.org
Fax: +36 1 266 1479 Twitter: @enablingNGOLaw

фондам, якія дзейнічаюць ў грамадскіх інтарэсах, дазволена кампенсаваць выдаткі валантэра, не выплачваючы падаходны падатак ад агульнай сумы выплаты.

**iv.** Калі няма выразна сфармуляваных ***нормаў прававой адказнасці*** для валантэрскай дзейнасці, можа быць цяжка высветліць, хто нясе адказнасць за шкоду, якую прычынілі трэцім бакам у выніку валантэрскай дзейнасці, а таксама шкоду, якую прычынілі самім валантэрам. Нормы прававой адказнасці звычайна адрозніваюцца ў грамадзянскім праве і працоўным праве, і, калі ў валантэра няма дакладнага статусу, становіцца незразумелым, якое права трэба ўжываць у сітуацыях, апісаных вышэй. Лепшай практыкай з'яўляецца наяўнасць асобных нормаў для валантэрскай дзейнасці, бо гэта дазваляе абараніць як валантэраў, так і трэція бакі.

**v.** ***Міжнародная валантэрская дзейнасць*** таксама заслугоўвае асаблівай увагі заканадаўцаў. У мэтах падтрымкі міждзяржаўнага супрацоўніцтва, нормы рэгулявання валантэрскай дзейнасці павінны ўтрымліваць дакладнае апісанне працэдуры атрымання віз і забяспечваць абарону замежных валантэраў, а таксама сваіх грамадзян, якія ажыццяўляюць валантэрскую дзейнасць за мяжой. Ўсеагульнай праблемай застаецца вызначэнне, нормы якой дзяржавы павінны ўжывацца ў дачыненні да замежных валантэраў: нормы краіны паходжання альбо нормы дзяржавы, у якой ажыццяўляецца валантэрская дзейнасць.

Дзяржава можа прымаць рашэнне далей развіваць прававыя рамкі для валантэрства ***з мэтай дасягнення пэўных станоўчых вынікаў***[13]***,*** такіх як эканамічнае развіццё, прасоўванне ідэй грамадзянскасці і грамадзянскай актыўнасці, скарачэнне ўзроўню беспрацоўя і іншых. Напрыклад, у **Чэхіі** ў чэрвені 2014 былі ўведзены папраўкі ў Акт аб валантэрскай дзейнасці, згодна з якімі былі ўведзеныя ацэначныя сертыфікаты, якія павінны служыць у якасці афіцыйнага пацверджання праходжання прафесійнай стажыроўкі, такім чынам дапамагаючы беспрацоўным у пошуку працы.

Дастаткова новым, але вельмі важным стымулам для развіцця рэгулявання валантэрскай дзейнасці з'яўляецца ***стварэнне механізму рэагавання на прыродныя катастрофы***, мэтай якога з'яўляецца кіраванне і паляпшэнне эфектыўнасці стыхійнай валантэрскай актыўнасці падчас прыродных катастрофаў. Сусветная канферэнцыя па змяншэнню небяспекі стыхійных бедстваў 2005 года выказала сваю падтрымку стварэнню такіх механізмаў. Яна таксама заклікала дзяржавы прасоўваць ідэі ўдзелу грамадскасці ў такога роду актыўнасці, а таксама забяспечваць стратэгічнае кіраванне валантэрскімі рэсурсамі ў надзвычайных сітуацыях[14].

## 4. МАШТАБЫ РЭГУЛЯВАННЯ

З-за таго, што краіны, рэгулюючы валантэрскую дзейнасць, пераследуюць розныя мэты, не існуе стандарту для вызначэння маштабу рэгулявання. Увесь кантэкст краіны, маецца на ўвазе яе палітычная, эканамічная, культурная і сацыяльная сітуацыя, а таксама існуючыя традыцыі валантэрства, грае тут вельмі важную ролю. Згодна з практыкамі ў еўрапейскіх краінах, часцей за ўсё закранаюцца наступныя пытанні:

[13] Валантэрская праграма ААН: Распрацоўка і імплементацыя законаў і праграм па валантэрству, 2011
[14] Там жа

ECNL
**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

- Азначэнне паняццяў “валантэр” і “валантэрская дзейнасць”
- Азначэнне паняцця “прымаючая арганізацыя”
- Змест валантэрскай дамовы і ўмовы, паводле якіх яна заключаецца
- Правы і абавязкі валантэра і прымаючай арганізацыі ў дачыненні адзін да аднаго
- Палажэнні па адказнасці, якія ўжываюцца ў дачыненні да асоб, якія парушаюць нормы валантэрскай дзейнасці
- Спагнанне падатку з выдаткаў, звязаных з ажыццяўленнем валантэрскай дзейнасці, напрыклад, выдаткі на паездкі, пражыванне валантэраў па-за месцам іх дзейнасці
- Стымулы для людзей прымаць удзел у валантэрскай дзейнасці, такія як сацыяльныя ільготы, ўнёскі ў дапамогу па беспрацоўю
- Умовы міжнароднай валантэрскай дзейнасці, а менавіта валантэрская дзейнасць сваіх грамадзян за мяжой і замежных грамадзян у сваёй краіне.

Галоўнай задачай рэгулявання валантэрскай дзейнасці з'яўляецца не “***перарэгуляваць”*** дадзеную сферу. Стварэнне складаных сістэм валантэрскай дзейнасці або ўвядзенне занадта вялікай колькасці патрабаванняў да прымаючых арганізацый і валантэраў можа дэматываваць іх ад ўсталявання валантэрскіх адносін. Напрыклад, азначэнне тэрміна “валантэр” павінна прызнаваць розныя формы валантэрскай дзейнасці, напрыклад, аднаразовае валантэрскае дзеянне, кароткатэрміновая і доўгатэрміновая валантэрская дзейнасць; валантэрская дзейнасць праз арганізацыю і індывідуальная валантэрская дзейнасць, і разглядацца яны павінны адпаведна.

Для кожнай формы валантэрскай дзейнасці павінны быць акрэслены свае ўмовы, а таксама павінны існаваць магчымасці для спантаннай кароткатэрміновай валантэрскай актыўнасці, у тым ліку па-за межамі прававых рамак. Напрыклад, у **Чэхіі** прасцей арганізаваць кароткатэрміновую валантэрскую дзейнасць, але доўгатэрміновая атрымлівае большую абарону; напрыклад, у доўгатэрміновых валантэраў (якія працуюць мінімум 20 гадзін на тыдзень) ўвесь час іх валантэрскай дзейнасці ўключаецца ў агульны разлік дапамогі па беспрацоўю. Аднак механізмы рэгістрацыі і справаздачнасці могуць быць дастаткова контрпрадуктыўнымі. Яны могуць выклікаць складанасці для дзяржаўных устаноў, якія займаюцца іх імплементацыяй і кіраваннем, а таксама ствараць дадатковую ношу для прымаючых арганізацый.

Апошнія трэнды валантэрскіх практык у Еўропе паказваюць, што ***міжнароднае валантэрства*** знаходзіцца на ўздыме і становіцца асабліва важным у краінах са слабай заангажаванасцю сваіх грамадзян у валантэрскую дзейнасць. Заканадаўцы таксама пачалі звяртаць увагу на гэтае пытанне, ствараючы асобныя ўмовы для міжнародных валантэраў, такія як магчымасць кампенсацыі больш высокіх выдаткаў у сувязі з выдаткамі на паездкі і пражыванне або гарантыі больш свабодных умоваў ўезду і знаходжання ў краіне, напрыклад, адмена віз для валантэраў.

## 5. МАДЭЛІ РЭГУЛЯВАННЯ

Падыходы да рэгулявання валантэрскай дзейнасці розняцца ад краіны да краіны, у залежнасці ад унутраных патрэбаў і праблем. Акрамя краін, дзе цалкам адсутнічае прызнанне валантэраў на прававым узроўні, такіх як Турцыя і Албанія, мы можам вылучыць тры агульных мадэлі рэгулявання валантэрскай дзейнасці ў Еўропе. Кожная мадэль можа прымаць розныя формы, у

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

залежнасці ад мноства фактараў, такіх як узровень ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці, мэты мясцовага права і існуючыя ў краіне прававыя рамкі. Ніжэй прадстаўлены тры мадэлі рэгулявання валантэрскай дзейнасці, якія характарызуюцца сваімі агульнымі прыкметамі, а таксама маюць свае перавагі і недахопы:

*I. Традыцыі, практыкі, самарэгуляванне і аналогія ў якасці захадаў прававога рэгулявання*

Характэрнай прыкметай гэтай мадэлі з'яўляецца тое, што ў краіне не існуе нацыянальнага заканадаўства, якое б вызначала выразны прававы статус валантэраў. Усе правілы, якія ўжываюцца у дачыненні да дадзенай сферы, альбо з'яўляюцца часткай не зафіксаваных у пісьмовым выглядзе традыцый і практык, альбо пакідаюцца на самарэгуляванне валантэрскімі арганізацыямі. Аднак, неабходна падкрэсліць, што такія меры рэгулявання не закранаюць ўсе пытанні, звязаныя з валантэрскай дзейнасцю, таму ў дачыненні да валантэраў таксама прымяняюцца некаторыя палажэнні агульнага нацыянальнага заканадаўства; напрыклад, нельга ўжываць не зафіксаваныя ў пісьмовым выглядзе практыкі і практыку самарэгулявання арганізацыяй у адносінах да умоваў падаткаабкладання.

- Гэтая мадэль звычайна ўжываецца ў краінах з добра развітай традыцыяй валантэрскай дзейнасці, напрыклад, у скандынаўскіх краінах і Вялікабрытаніі, дзе азначэнне заангажаванасці ў валантэрскую дзейнасць і ўсе адпаведныя палажэнні можна атрымаць з існуючых традыцый і практык альбо з практыкі самарэгулявання арганізацый.
- Станоўчым аспектам дадзенай мадэлі з'яўляецца тое, што традыцыі валантэрскай дзейнасці ўжо шырока распаўсюджаныя сярод насельніцтва дадзенай краіны, таму проста няма неабходнасці ўводзіць абавязковае прававое рэгуляванне.
- Асаблівасцю дадзенай мадэлі з'яўляецца неабходнасць наяўнасці ўкаранённых практык, якія на самой справе ствараюць пісьмова не зафіксаваныя прававыя рамкі для валантэрскай дзейнасці. У краінах з менш развітай культурай валантэрства не так шмат традыцый, якія б рэгулявалі валантэрскую актыўнасць, таму ў такіх выпадках менавіта законы могуць станавіцца неабходнымі інструментамі рэгулявання.

***Прыклады краін:***

**Швецыя**

Швецыя з'яўляецца адным з лепшых прыкладаў краін з глыбока ўкаранёнай традыцыяй валантэрства. Прыярытэтам гэтай краіны з'яўляецца захаванне незалежнасці і аўтаноміі сектара, а таксама ўніканне прыняцця якога-небудзь заканадаўчага рэгулявання. Таму ўсе прававыя канфлікты, якія ўзнікаюць у сферы валантэрскай дзейнасці, вырашаюцца на падставе прэцэдэнтнага права. Дамовы заключаюцца на падставе пагаднення паміж валантэрам і прымаючай арганізацыяй. Не існуе палажэнняў, якія рэгулююць падаткаабкладанне кампенсацыі неабходных выдаткаў валантэраў. Пры гэтым, паводле агульных палажэнняў падатковага кодэксу, даход, у памеры ніжэй пэўнага парога, не абкладваецца падаткам. З-за

Address: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
Phone: +36 1 318 6923 Web: www.ecnl.org
Fax: +36 1 266 1479 Twitter: @enablingNGOLaw

таго, што агульная сума кампенсацыі ў большасці выпадкаў не перавышае дадзены ліміт, валантэры звычайна не плацяць ніякіх падаткаў[15].

**Вялікабрытанія**

Сітуацыя ў Вялікабрытаніі таксама досыць спецыфічная. Тут не існуе нацыянальнага заканадаўства, якое б дакладна рэгулявала статус валантэраў, таму ў дачыненні да асоб, якія займаюцца валантэрскай дзейнасцю, ўжываецца агульнае права. Валантэрскія арганізацыі, гэта значыць арганізацыі, якія прымаюць валантэраў, ўспрымаюцца як органы самакіравання, таму ім дазволена рэгуляваць сваю дзейнасць і ўнутраныя справы самастойна. Такім чынам, усе ўмовы ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці залежаць ад правілаў самарэгулявання арганізацыі, а таксама ад пагаднення паміж валантэрам і прымаючай арганізацыяй. Аднак, існуе таксама Комплексны кодэкс добрых практык валантэрскай дзейнасці, які прызнае вялікае значэнне валантэрства і вызначае, якія крокі неабходна рабіць, каб ліквідаваць усе магчымыя перашкоды ў ажыццяўленні валантэрскай дзейнасці. Праблемай, праўда, застаецца забеспячэнне прымянення дадзенага Кодэкса, бо ён да гэтага часу не атрымаў дастатковай падтрымкі з боку ўрада і не з'яўляецца юрыдычна абавязковым[16].

## *II. Палажэнні рэгулявання, уключаныя ў розныя законы, якія закранаюць валантэрства*

Згодна гэтай мадэлі рэгулявання, пытанні, якія закранаюць валантэрскую дзейнасць, разглядаюцца ў асобных законах, у залежнасці ад характару пэўных палажэнняў. Азначэнне тэрмінаў “валантэр” і “валантэрская дзейнасць”, а таксама палажэнні адносна правоў і ільгот для валантэраў звычайна ўтрымліваюцца ў законах, якія рэгулююць розныя формы АГС, як, напрыклад, у Латвіі; ў законах аб статусе грамадскай карысці, як, напрыклад, у Польшчы; і ў іншых законах, як, напрыклад, у Кодэксе абавязкаў у Швейцарыі. У некаторых краінах прызнаюць статус толькі маладых валантэраў, а палажэнні, якія рэгулююць іх валантэрскую актыўнасць, утрымліваюцца ў законах па моладзевай палітыцы, як, напрыклад, у Косава і Беларусі. Такім чынам, некаторыя палажэнні могуць утрымлівацца ў працоўным праве, а падатковае рэгуляванне - у падатковым заканадаўстве.

- Гэтая мадэль дазваляе хутка адказваць на патрэбнасці ў рэгуляванні, якія ўзнікаюць, бо не патрабуе працяглых кансультацый, аналізу і палітычных пагадненняў, якія схільны зацягвацца.
- Складанай задачай можа апынуцца забеспячэнне адпаведнасці адзін аднаму ўсіх палажэнняў па валантэрскай дзейнасці, якія змяшчаюцца ў розных законах, якое неабходна для іх паспяховага прымянення на практыцы. Напрыклад, калі дакладны прававы статус валантэра вызначаецца законам аб НДА, гэты статус таксама павінен прызнавацца падатковым заканадаўствам, якое ў тым ліку павінна вызначаць умовы падаткаабкладання кампенсацыі выдаткаў валантэраў.
- У той жа час рэгуляванне, якое прынялі «на хуткую руку», можа прыводзіць да сітуацый, калі розныя стэйкхолдэры выключаюцца з працэсу кансультацый (уключаючы АГС), а прынятыя палажэнні не адпавядаюць патрэбам валантэраў і прымаючых арганізацый.

[15] GHK: Даследванне валантэрства ў Еўрапейскім Саюзе, даклад па краіне, Швецыя, 2012. Доступ па спасылцы: http://ec.europa.eu/citizenship/pdf/national_report_se_en.pdf
[16] GHK: Даследванне валантэрства ў Еўрапейскім Саюзе, даклад па краіне, Вялікабрытанія, 2012. Доступ па спасылцы: http://ec.europa.eu/citizenship/pdf/national_report_uk_en.pdf

ECNL

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

### *Прыклады краін:*

**Латвія**

Нягледзячы на заканадаўчыя ініцыятывы па прыняццю асобнага закона аб валантэрстве, у Латвіі ўсё яшчэ няма адзінага закона, які б рэгуляваў валантэрскую дзейнасць. Азначэнне тэрміна "валантэр" можна знайсці ў Законе аб аб'яднаннях і фондах ад 2003 года. Паводле дадзенага закону, валантэр можа запытваць пакрыццё ягоных расходаў; аднак ва ўсім прававым полі не вызначаныя правілы падаткаабкладання, якія ўжываюцца ў дачыненні да валантэраў. Таксама няма асобных палажэнняў рэгулявання адносна іншых пытанняў, якія тычацца валантэрства, такіх як медыцынскае страхаванне або дапамога па беспрацоўю, таму яны рэгулююцца, зыходзячы з агульных палажэнняў адпаведных законаў. Акрамя Закона аб аб'яднаннях і фондах, існуе таксама Закон аб моладзі, прыняты ў 2009 годзе. У законе даецца азначэнне тэрміна "моладзевае валантэрства", а таксама рэгулюецца адказнасць прымаючых арганізацый у дачыненні да маладых валантэраў.

**Косава**

Прававыя рамкі ў Косава прызнаюць толькі моладзевае валантэрства. Закон аб пашырэнні правоў і магчымасцяў моладзі, прыняты ў 2003 годзе, дае азначэнне паняццю "валантэрская дзейнасць моладзі" і забараняе яе ажыццяўленне ў асабістых або сямейных карыслівых інтарэсах.

Адпаведна, закон кажа, што валантэрская дзейнасць маладых людзей не ўзнагароджваецца, пры гэтым не вызначаючы умоваў кампенсацыі выдаткаў валантэраў[17]. Закон кажа, што неабходна заключаць дамову паміж валантэрам і арганізатарам валантэрскай дзейнасці, а ўдзел у валантэрскай дзейнасці павінен прызнавацца як досвед працы. Нягледзячы на добрую волю заканадаўцаў даць маладым валантэрам пэўныя ільготы, дадзенае рэгуляванне досыць павярхоўнае і не вызначае дэталёвыя палажэнні адносна правоў валантэраў.

**Польшча**

Польшча - прыклад краіны з досыць складанай сістэмай рэгулявання валантэрскай дзейнасці, якая змяшчаецца ў адным дакуменце; аднак розныя палажэнні рэгулявання з'яўляюцца таксама неад'емнай часткай іншых законаў. Акт аб грамадскай карысці і валантэрскай працы 2003 года, з апошнімі папраўкамі ад 2010 года, ўключае ў сябе асобны раздзел па рэгуляванню валантэрскай дзейнасці. Паводле гэтага закона, валантэры дзейнічаюць у падтрымку няўрадавых арганізацый, органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацыйных структур, даючы справаздачнасць па сваёй дзейнасці ў органы дзяржаўнага кіравання. Такія ж палажэнні павінны ўжывацца ў дачыненні да валантэрскай дзейнасці ў рамках міжнародных арганізацый, якія маюць свае аддзяленні ў Польшчы. Паводле дадзенага закону, валантэрам даецца мноства

[17] Розніца паміж пакрыццём выдаткаў і ўзнагародай заключаецца ў тым, што пакрыццё выдаткаў - гэта выплата за выдаткі, звязаныя з ажыццяўленнем валантэрскай дзейнасці, у той час як ўзнагароджанне - гэта аплата за запытаныя паслугі, якая ўяўляе сабой матэрыяльнае ўзнагароджанне, таму такога роду праца ня можа лічыцца "працай без кампенсацыі", што з'яўляецца абавязковай характарыстыкай валантэрскай працы.

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

ільгот і правоў, такіх як пакрыццё выдаткаў на паездкі і выплата суткавых ў такім жа памеры, як і ў дачыненні да наёмных работнікаў, кампенсацыя іншых неабходных выдаткаў, права на дапамогу па дагляду падчас хваробы і інш. Больш за тое , дадзены закон уводзіць дадатковыя ільготы для валантэраў, якія дэлегуюцца для працы ў іншыя краіны, такія як медыцынскае страхаванне замежных работнікаў, страхаванне на выпадак траўмы, пакрыццё дадатковых выдаткаў на паездкі і інш.

**Балгарыя**

У Балгарыі існуе ініцыятыва аб прыняцці двух асобных законаў аб валантэрскай дзейнасці. Законапраект аб валантэрскай дзейнасці ад 2006 года і Законапраект аб развіцці моладзі ад 2008 года да гэтага часу чакаюць адабрэння парламентам. Існуючыя прававыя рамкі рэгулявання валантэрскай дзейнасці падзеленыя ў некалькі асобных законаў, а менавіта Закон аб урэгуляванні крызісаў (2005), Закон аб балгарскім Чырвоным Крыжы (1995) і Закон аб фізкультуры і спорце (1996). Закон аб урэгуляванні крызісаў рэгулюе валантэрскую дзейнасць у надзвычайных сітуацыях; згодна з ім, асобы, якія прымаюць удзел у валантэрскай дзейнасці, маюць права на асноўным працоўным месцы сысці ў неаплачваемы адпачынак. Закон аб балгарскім Чырвоным Крыжы рэгулюе дзейнасць Чырвонага Крыжа і прызнае валантэрства ў якасці "фундаментальнага прынцыпу руху Чырвонага Крыжа". Цікавым з'яўляецца той факт, што абодва закона ўтрымліваюць асобныя палажэнні па падаткаабкладанню, звязанага з валантэрскай дзейнасцю. Закон аб фізкультуры і спорце рэгулюе неабавязковую спартыўную актыўнасць студэнтаў, якая лічыцца валантэрскай дзейнасцю. У дадатак, арганізацыі таксама прымаюць нормы самарэгулявання ў выглядзе "кодэксаў паводзінаў". Гэтыя нормы тычацца толькі нейкай пэўнай арганізацыі, яны звычайна вызначаюць ключавыя каштоўнасці і стандарты якасці яе валантэрскай дзейнасці[18].

**Францыя**

Францыя прызнае дзьве формы ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці: *Bénévolat* і *Volontariat. "Bénévoles"* - асобы, якія маюць прызнаны камерцыйны або некамерцыйны статус, напрыклад, наёмныя работнікі ці студэнты, з дадатковымі правамі, якія вынікаюць з іх удзелу ў валантэрскай дзейнасці. Такая форма ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці, аднак, ня мае выразнага прававога статусу, таму такія валантэры могуць займацца любой іншай дадатковай дзейнасцю. *"Volontaires"* жа - гэта асобы, якія маюць прызнаны прававы статус валантэраў, і яны займаюцца выключна валантэрскай дзейнасцю. Абедзьве формы рэгулююцца мноствам законаў. У той час, як у дачыненні да *Bénévoles* прымяняюцца ў асноўным прававыя палажэнні, якія тычацца іх асноўнага статусу, *Volontairiat* рэгулюецца мноствам асобных законаў, такіх як, напрыклад, Валантэрская дзейнасць у аб'яднаннях, Грамадзянская валантэрская дзейнасць, Міжнародная валантэрская дзейнасць у кампаніях, Валантэрская грамадзянская служба і іншымі.

[18] GHK: Даследванне валантэрства ў Еўрапейскім Саюзе, даклад па краіне, Балгарыя, 2012 г.. Доступ па спасылцы: http://ec.europa.eu/citizenship/pdf/national_report_bg_en.pdf

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

## *III. Асобны ўсёабдымны закон аб валантэрскай дзейнасці*

Гэта тая мадэль рэгулявання, якая выкарыстоўваецца ў Еўропе часьцей за ўсё, калі ўсе палажэнні, якія рэгулююць валантэрскую дзейнасць, аб'яднаныя ў адзін дакумент. Ад краіны да краіны можна знайсці розныя варыяцыі дадзенай мадэлі, у залежнасці ад маштабу рэгулявання альбо структуры. Часам у гэты адзіны закон уключаны ня ўсе палажэнні, тады звычайна ўмовы падаткаабкладання валантэраў пакідаюцца на рэгуляванне адпаведнымі падатковымі законамі.

- Станоўчым аспектам асобнага закона аб валантэрскай дзейнасці з'яўляецца той факт, што ён дае адказы на ўсе пытанні, якія тычацца ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці, у адным дакуменце, выразна акрэсліваючы “правілы гульні” (напрыклад, у Македоніі).
- Добра распрацаваны асобны закон можа быць эфектыўным інструментам прасоўвання валантэрскай актыўнасці і, сумесна з дзяржаўнай палітыкай і стратэгіяй, можа ўнесці свой унёсак у развіццё валантэрскай традыцыі ў краіне.
- Агульнай задачай заканадаўцаў з'яўляецца прыняццё такога адзінага закона, які б спрыяў развіццю валантэрскай дзейнасці, але пры гэтым не “перарэгуляваў” дадзеную сферу (гл. прыклад Малдовы).
- Іншай задачай з'яўляецца забеспячэнне ўдзелу ўсіх стэйкхолдэраў ў працэсе распрацоўкі законапраекта, з мэтай атрымаць такі закон, які б адпавядаў рэальным патрэбам сектара.
- У той жа час забяспечыць імплементацыю асобнага закона складаней, у параўнанні з іншымі мадэлямі рэгулявання.

***Прыклады краін:***

**Новыя законы аб валантэрскай дзейнасці[19]**:

**Літва**

Закон аб валантэрскай дзейнасці, прыняты ў чэрвені 2011, дазваляе грамадзянам і замежнікам, ва ўзросце 14 гадоў і больш, на законных падставах заставацца ў Літве з мэтай ажыццяўлення валантэрскай дзейнасці. Закон уводзіць прынцыпы валантэрства, такія як карысць для грамадства і індывіда, супрацоўніцтва, разнастайнасць і гнуткасць. Адпаведна, ён дае спіс асноўных правоў і абавязкаў валантэра і прымаючай арганізацыі, а таксама вызначае ўмовы, згодна з якімі павінна заключацца дамова паміж імі. Кампенсацыя выдаткаў, звязаных з валантэрскай дзейнасцю, ня лічыцца прыбыткам, таму падаткам не абкладваецца. Рэгуляванне міжнароднай валантэрскай дзейнасці павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з канкрэтнай валантэрскай праграмай, напрыклад, Еўрапейскай валантэрскай службай.

[19] З падрабязнай інфармацыяй адносна іншых законаў аб валантэрскай дзейнасці можна азнаёміцца ў папярэдніх даследваннях МЦНП / ЕЦНП, напрыклад: Кэтрын Шы і Кацярына Хадзі-Міцэва - Права аб валантэрах і валантэрскай дзейнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, 2007 ці Кацярына Хадзі-Міцэва - Параўнальны аналіз еўрапейскіх прававых сістэм і практык у дачыненні да валантэрскай дзейнасці, 2007.

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

**Македонія**

Македонскі Закон аб валантэрстве 2007 з'яўляецца прыкладам закона, які аб'ядноўвае ўсе прававыя палажэнні адносна валантэрскай дзейнасці ў адзін дакумент. Закон дае дэталёвае апісанне правоў і абавязкаў валантэраў і прымаючых арганізацый, умоваў падаткаабкладання, якія ўжываюцца да кампенсацыі выдаткаў валантэраў, умоваў страхавання валантэраў, а таксама вызначае адказнасць за правапарушэнні. Акрамя таго, ён змяшчае апісанне умоваў міжнароднай валантэрскай дзейнасці, дазваляючы грамадзянам займацца валантэрствам за мяжой, а замежным грамадзянам - у Македоніі.

**Малдова**

Закон аб валантэрскай дзейнасці быў прыняты ў 2010 годзе. Ён з'яўляецца прыкладам добрай ініцыятывы, якую цяжка ўвасобіць на практыцы з-за вялікіх маштабаў самога закона і другасных рэгулятыўных палажэнняў, такіх як рэгуляванне стандартаў мінімальнай якасці валантэрскай дзейнасці, рэгуляванне акрэдытацыі прымаючых арганізацый і г.д. Закон уводзіць спіс азначэнняў, асноўныя прынцыпы, ўмовы рэгулявання адносін паміж валантэрамі і прымаючымі арганізацыямі, абавязковую рэгістрацыю валантэраў, якія ўдзельнічаюць у валантэрскай дзейнасці 20 гадзін у месяц і больш. Ён таксама змяшчае шырокі спіс ільгот для валантэраў, напрыклад, досвед валантэрскай дзейнасці залічваецца ў якасці досведу працы і ўлічваецца пры разліку пенсій, а таксама залічваецца ў якасці акадэмічных гадзін у студэнтаў. Пры гэтым узнікаюць цяжкасці пры распрацоўцы і прыняцці другаснага рэгулявання, і ўся створаная сістэма не працуе да гэтага часу.

**Славакія**

Закон аб валантэрскай дзейнасці 2011 адрозніваецца ад астатніх законаў такога кшталту галоўным чынам дэталёвым апісаннем тэрмінаў “валантэр”, “валантэрская дзейнасць” і “прымаючая арганізацыя”. Станоўчым аспектам дадзенага закона з'яўляецца тое, што ён дакладна вызначае маштабы рэгулявання; аднак у ім адсутнічаюць палажэнні аб адказнасці ў дачыненні да трэціх асоб, міжнароднай валантэрскай дзейнасці, кампенсацыі выдаткаў і іншыя. Таму дадзены закон не з'яўляецца ў поўнай меры усёабдымным і залежыць ад палажэнняў рэгулявання, якія змяшчаюцца ў іншых законах.

**Сербія**

Сербскі Закон аб валантэрскай дзейнасці 2010 года, у адрозненне ад славацкага закона, вызначае выразныя рамкі рэгулявання валантэрскай дзейнасці. Акрамя асноўных азначэнняў, закон утрымлівае агульныя прынцыпы валантэрскай дзейнасці, такія як салідарнасць і падтрымка валантэрства, абарона валантэраў, прынцып альтруізму і іншыя. Закон акрэслівае розніцу паміж кароткатэрміновым і доўгатэрміновым валантэрствам, вызначаючы, што доўгатэрміновым з'яўляецца валантэрства па 10 гадзін у тыдзень і больш на працягу тэрміну ад 3 месяцаў і больш. Адпаведна, да гэтых тыпах валантэрства ўжываюцца розныя правілы, напрыклад, доўгатэрміновыя валантэры абавязаны заключаць пісьмовую дамову, але пры гэтым ім гарантуецца медыцынскае страхаванне. Цікавым фактам з'яўляецца тое, што ўдзел у дзейнасці Чырвонага Крыжа выключаны са сферы рэгулявання дадзеным законам.

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

**Украіна**

Украінскі Закон аб валантэрскай дзейнасці, прыняты ў 2011 годзе, акрэслівае абмежаваны маштаб дзейнасці, якая лічыцца валантэрскай паводле гэтага закону. Адпаведна, ён вызначае ўмовы атрымання сертыфікацыі валантэрскай арганізацыяй і ўмовы пазбаўлення сертыфікацыі. Закон служыць таксама ў якасці рэгулявання палітычнага курсу і кажа, што дзяржава рэалізуе свае палітычныя мэты пры дапамозе валантэрскай дзейнасці. Закон гарантуе валантэрам пэўныя правы, такія як права на страхаванне, на кампенсацыю выдаткаў, на выплату дапамогі па хваробе, звязанай з валантэрскай дзейнасцю, і іншыя. Закон лічыцца дастаткова нейтральным і не змяшчае эфектыўных стымулаў да ўдзелу ў валантэрскай дзейнасці.

**Грузія**

Грузія знаходзіцца на шляху да прыняцця свайго першага закона аб валантэрскай дзейнасці. Да гэтага часу там не існуе юрыдычнага азначэння паняцця “валантэры”, якое б давала ім выразны статус і вызначала іх правы і абавязкі. Такім чынам, да ўсіх валантэраў ужываюцца палажэнні згодна з іх статусу па Працоўнаму Кодэксу (працуючы, беспрацоўны, студэнт ці пенсіянер). Адпаведна, палажэнні падатковага рэгулявання прымяняюцца да іх таксама згодна з такім статусам. Існуюць 2 галоўныя прававыя перашкоды ў ажыццяўленні валантэрскай дзейнасці ў Грузіі, якія закранаюцца Законапраектам аб валантэрскай дзейнасці. З аднаго боку, законапраект досыць ліберальны ў дачыненні да валантэраў, азначэнне тэрміна “валантэр” кажа, што валантэрам можа быць асоба, старэйшая за 16 гадоў, але са згоды апекуноў дазваляецца ўдзел у валантэрскай дзейнасці таксама асоб, малодшых за гэты ўзрост. Заключэнне пісьмовай дамовы з'яўляецца абавязковым толькі па запыце валантэра, дамова можа быць складзена на любой мове. З іншага боку, законапраект уводзіць мноства абавязкаў для прымаючых арганізацый, такіх як абавязковая кампенсацыя неабходных выдаткаў або кампенсацыя шкоды, выкліканай неправамернымі дзеяннямі валантэраў падчас ажыццяўлення валантэрскай дзейнасці, трэцім асобам. Законапраект ня ўтрымлівае ніякіх палажэнняў у дачыненні да рэгулявання міжнароднай валантэрскай дзейнасці.

**Расія**

У 2012 годзе Грамадская палата Расійскай Федэрацыі абвясціла аб намеры прыняць законапраект аб валантэрскай дзейнасці ў якасці рэакцыі на спантанную валантэрскую актыўнасць падчас паводкі ў Крымску. Законапраект быў падрыхтаваны ў аднабаковым парадку, без удзелу грамадскасці і адкрытых дыскусій па гэтым пытанні. Акрамя іншых палажэнняў, законапраект абавязвае валантэраў заўсёды заключаць дамову з прымаючай арганізацыяй. Ён таксама не адрознівае розныя формы валантэрскай дзейнасці. Дадзены законапраект ўспрымаецца толькі як лішняя бюракратычная ноша, асабліва калі справа тычыцца спантаннай валантэрскай актыўнасці падчас надзвычайных сітуацый. Больш за тое, ён уводзіць патрабаванне абавязковай рэгістрацыі валантэраў у органах мясцовай улады, што можа быць успрынята як намер дзяржавы кантраляваць ўдзел грамадзян у валантэрскай дзейнасці. Асабліва турбуе надзяленне дзяржаўных уладаў правам рэгуляваць дзеянні валантэраў і маніторыць валантэрскую актыўнасць.

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web**: www.ecnl.org
**Fax**: +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

**Наступная табліца паказвае, у якіх сітуацыях рэкамендуецца ўжываць кожную канкрэтную мадэль рэгулявання:**

| Мадэль рэгулявання | Рэкамендуецца ўжываць, калі… | Не рэкамендуецца ўжываць, калі… |
|---|---|---|
| **1 модель** Традыцыі, практыкі, самарэгуляванне і аналогія ў якасці мер прававога рэгулявання | ... у краіне існуе моцная традыцыя валантэрства і няма канкрэтных прававых палажэнняў,якія перашкаджаюць валантэрскай дзейнасці | ... існуе неабходнасць папулярызаваць і падтрымліваць валантэрства, а таксама развіваць культуру і традыцыю валантэрства<br>... існуюць прававыя рамкі, якія ўключаюць палажэнні, якія ствараюць прававыя перашкоды для ажыццяўлення валантэрскай дзейнасці |
| **2 мадэль** Палажэнні рэгулявання, уключаныя ў розныя законы, якія закранаюць пытанні валантэрскай дзейнасці | ... існуе неабходнасць ліквідаваць пэўныя прававыя перашкоды ў дачыненні да валантэрскай дзейнасці<br>... ёсць абгрунтаваныя сумневы, што асобны закон можа ўвесці занадта шмат цяжкіх патрабаванняў у дачыненні да валантэраў і прымаючых арганізацый | ... існуе складаны набор прававых перашкод, якія замінаюць ажыццяўленню валантэрскай дзейнасці<br>... існуе неабходнасць папулярызаваць валантэрскую актыўнасць і стварыць стымулы для ўдзелу грамадзян у валантэрскай дзейнасці |
| **3 мадэль** Асобны ўсёабнымны закон аб валантэрскай дзейнасці | ... існуе неабходнасць папулярызаваць валантэрскую актыўнасць і ўмацаваць валантэрскую традыцыю ў краіне<br>... існуе складаны набор прававых перашкод, якія неабходна ліквідаваць, каб спрыяць валантэрскай актыўнасці | ... існуюць абгрунтаваныя сумневы, што асобны закон “перарэгулюе” валантэрскую дзейнасць і ўвядзе цяжкія патрабаванні, якія дэматывуюць валантэраў і прымаючыя арганізацыі ўсталёўваць валантэрскія адносіны |

## 6. ПРАЦЭС РАСПРАЦОЎКІ І ПРЫНЯЦЦЯ РЭГУЛЯВАННЯ

На аснове агляду падобных працэсаў распрацоўкі законапраектаў у еўрапейскіх краінах, калі існуе рашэнне прыняць палажэнні рэгулявання ў дачыненні да валантэрскай дзейнасці, рэкамендуецца прытрымлівацца наступных крокаў:

- **Вызначыць мэты рэгулявання.** Стэйкхолдэры, такія як АГС, групы валантэраў, навукоўцы, прадстаўнікі ўрада і іншыя, павінны сумесна з органам, адказным за распрацоўку рэгулявання, вызначыць мэты рэгулявання. Мэтамі прыняцця рэгулявання могуць быць, напрыклад, папулярызацыя валантэрскай актыўнасці, ліквідацыя пэўных прававых

Address: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
Phone: +36 1 318 6923 Web: www.ecnl.org
Fax: +36 1 266 1479 Twitter: @enablingNGOLaw

перашкод або стварэнне стымулаў для валантэраў. Такім чынам, трэба таксама вызначыць патэнцыйныя праблемныя моманты, якія могуць паўстаць пры дасягненні гэтых мэтаў.

- **Правесці аналіз прававых рамак**. Варта правесці аналіз законаў, якія распаўсюджваюцца на валантэрскую дзейнасць, а таксама ацэнку патрэбаў.
- **Забяспечыць шматбаковасць і адкрытасць працэсу распрацоўкі рэгулявання.** Працэс распрацоўкі рэгулявання павінен быць шматбаковым і адкрытым, што дае магчымасць праводзіць грамадскія кансультацыі. Орган, адказны за распрацоўку, павінен збіраць працоўную групу, якая складаецца з розных стэйкхолдэраў, якая б аказвала яму дапамогу ў працэсе распрацоўкі рэгулявання. Закон не павінен прадстаўляць сабой аднабаковае рашэнне ўрада аб рэгуляванні валантэрскай дзейнасці.
- **Улічваць досвед іншых краін.** Каб распрацаваць паспяховае рэгуляванне, рэкамендуецца ўлічваць досвед іншых краін у прыняцці палажэнняў рэгулявання у дачыненні да валантэрства і вучыцца на іх памылках.
- **Распрацаваць план імплементацыі.** Вельмі важна не забыцца на імплементацыю палажэнняў рэгулявання і распрацаваць выразны і дэталёвы план яшчэ ў працэсе распрацоўкі. Рэгуляванне не павінна ствараць занадта складаныя механізмы, якія цяжка і дорага выкарыстоўваць на практыцы[20].

## 7. РЭКАМЕНДАЦЫІ І ЎРОКІ

Ніжэй прадстаўлены падсумаваныя рэкамендацыі і ўрокі, вывучаныя на аснове еўрапейскіх практык рэгулявання валантэрскай дзейнасці:

### 1 Рашэнне, ці трэба рэгуляваць валантэрскую дзейнасць, і калі так, то як:

- **Вызначце мэты і маштабы рэгулявання.** Перад тым, як ўвесці рэгуляванне валантэрскай дзейнасці, рэкамендуецца вызначыць яго мэты, гэта значыць якія мэты павінны быць дасягнуты шляхам увядзення рэгулявання валантэрскай дзейнасці. Некаторыя палажэнні рэгулявання могуць ствараць стымулы для ўдзелу людзей у валантэрскай дзейнасці і папулярызаваць валантэрства. Іншыя прапаноўваюць комплексны набор палажэнняў, якія рэгулююць валантэскую актыўнасць, правы і абавязкі валантэраў і прымаючыхарганізацый і інш.
- **Абярыце неабходную мадэль рэгулявання.** Пры выбары пасуючай мадэлі рэгулявання рэкамендуецца звяртаць увагу на кантэкст краіны і валантэрскую традыцыю, а таксама прымаць пад увагу існуючыя прававыя рамкі. Не заўсёды ёсць неабходнасць ўводзіць спецыяльныя палажэнні рэгулявання ў дачыненні да валантэрства, як гэта можна ўбачыць на прыкладзе розных еўрапейскіх краін. Але ўсё ж рэкамендуецца рэгуляваць прававыя перашкоды, якія замінаюць валантэрскай актыўнасці.

[20] Больш дэталёвую інфармацыю аб працэсе распрацоўкі і імплементацыі рэгулявання можна знайсці: Валантэрская праграма ААН: Распрацоўка і імплементацыя законаў і праграм аб валантэрстве, 2011, падрыхтавана МЦНП / ЕЦНП

**Address**: 1052 Budapest, Apáczai Csere János u. 17, Hungary
**Phone**: +36 1 318 6923 **Web:** www.ecnl.org
**Fax:** +36 1 266 1479 **Twitter**: @enablingNGOLaw

### 2. Працэс распрацоўкі рэгулявання

- **Забяспечце шматбаковасць працэсу распрацоўкі і прыняцця рэгулявання.** Каб распрацаваць функцыянальнае рэгуляванне, якое адпавядае патрэбам сектара, важна далучаць розных стэйкхолдэраў да працэсу распрацоўкі (АГС, валантэраў, экспертаў і інш.)
- **Закранайце пытанні, якія ствараюць прававыя перашкоды для валантэрства.** Каб спрыяць развіццю валантэрскай актыўнасці ў краіне, важна ліквідаваць прававыя перашкоды, якія замінаюць гэтаму, такія як падаткаабкладанне кампенсацыі выдаткаў, адсутнасць дапамогі па беспрацоўю і іншыя. Рэкамендуецца ўвесці выразны прававы статус для валантэраў, які дазваляў бы ліквідаваць такія перашкоды, адрозніваючы валантэрскія адносіны ад усіх астатніх у асноўным працоўных адносін.
- **Не "перарэгулюйце" валантэрскую дзейнасць.** Калі маецца рашэнне распрацаваць асобны закон аб валантэрскай дзейнасці, рэкамендуецца пастарацца не "перарэгуляваць" яе. Таксама важна не ўводзіць занадта шмат патрабаванняў у дачыненні да валантэраў і прымаючых арганізацый, бо гэта дэматывуе іх ад ўсталявання валантэрскіх адносін.

### 3. Імплемэнтацыя рэгулявання.

- **Распрацуйце план імплементацыі.** Пры распрацоўцы рэгулявання валантэрскай дзейнасці важна заўсёды прымаць пад увагу, якім чынам асобныя палажэнні рэгулявання павінны працаваць на практыцы. Рэкамендуецца распрацоўваць план імплементацыі яшчэ ў працэсе распрацоўкі рэгулявання.